## БИБЛИОГРАФИЧЕСКИЕ ССЫЛКИ

1. Лиотар Ж.-Ф. Состояние постмодерна. СПб.: Алетейя, 1988.
2. Горбунова Л.И. Постмодерн как тенденция развития культуры XX века // Вест. МГТУ. 2011. № 2. С. 265–271.
3. Harvey D. The Condition of Postmodernity. Oxford, 1990.
4. Фуко М. Воля к истине: по ту сторону знания, власти и сексуальности: работы разных лет. Минск: Касталь, 1996.
5. Делез Ж. Различие и повторение; перевод с фр. СПб : ТОО ТК «Петрополис», 1998.
6. Бронзино Л. Ю. Постмодернизм: сущностные идеи и их представители // Вест. МГИМО. 2010. № 3. С. 97–105.
7. Бодрийяр Ж. Симулякры и симуляция // Философия эпохи постмодерна. Минск: Красико-принт, 1996. С. 32-47.
8. Подшибякин А.М. Текст, значение, смысл: постмодернизм как игра // Философия XX века: школы и концепции. СПб.: Санкт-Петербургское философское общество, 2001. С. 194–195.
9. Терещенко Н.А., Шатунова Т.М. Постмодерн как ситуация философствования. СПб.: Алетейя, 2003.
10. Кравченко С.А. Социологический постмодернизм: теоретические источники, концепции, словарь терминов. М.: МГИМО-Университет, 2010.


# МУЗЫЧНАЯ КУЛЬТУРА ЯК ФАКТАР РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ

# THE MUSICAL CULTURE AS A FACTOR IN THE DEVELOPMENT OF THE BELARUSIAN IDENTITY


***Я.А. Лойка***

***Y. Loika***

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Мінск, Беларусь
Belarusian State University
Minsk, Belarus
*e-mail: yaugeniyaloyka.vuch@gmail.com*



Даследванне музычнай культуры Беларусі, асабліва народнай, у апошнія гады спрыяе ўсё больш дакладнаму разуменню беларускай душы і, як вынік, абгрунтаванню нацыянальнай самасвядомасці. У дадзеным даследванні праводзілася спроба аналізу народнай музычнай творчасці праз прызму семіятычнага, аксіялагічнага і гісторыка-культуралагічнага падыходаў.

The study of the musical culture of Belarus, especially Folk music, in recent years has contributed to an increasingly accurate understanding of the Belarusian soul and, as a result, the justification of national identity. In this

work an attempt was made to analyze folk music through the prism of semiotic, axiological and historical-cultural approaches.

*Ключавыя словы:* музычнае мастацтва Беларусі; нацыянальная самасвядомасць.

*Keywords:* musical culture of Belarus; national consciousness.

Беларуская музычная спадчына – сапраўдны скарб беларускай і сусветнай культуры. І, нягледзячы на тое, што сёння мы не ўсё ведаем пра творчую дзейнасць нашых продкаў, але нават на гэтым этапе ўжо становіцца магчымым прыблізіцца да вывучэння мыслення беларускага народа і працэса яго фарміравання разам з нацыянальнай самасвядомасцю на пэўным навуковым узроўні, выкарыстоўваючы цэлы шэраг падыходаў: семіятычны, аксіялагічны, гісторыка-культуралагічны падыходы.

Спачатку акрэслім тэрмін нацыянальная самасвядомасць – гэта ўсвядамленне прадстаўніка пэўнага этнасу аб сваёй прыналежнасці да свайго народу, любоў і павага да сваіх каранёў, землякоў. На Беларусі своеасаблівай квінтэсэнцыяй нацыянальнай самасвядомасці з’яўляецца абазначаная нашымі пісьменнікамі-філосафамі паняцце «беларускасць» – тое, што адрозневае нас ад іншых народаў. Каб выключыць цень шавінізму, адзначу, што па ўнутранай сутнасці «беларускасць» можна параноўнаць з Лотманаўскім абазначэннем рускага паняцця «інтэлігентнасць», што таксама ў сваю чаргу з’яўляецца адным з рускіх культурных маркераў. І адзначым, што гэтыя патэрны паводзін увасабляюць у сабе ў чыстым выглядзе самые лепшыя якасці славянскага чалавека, што маюць характэрны гуманістычны напрамак. Гэты кірунак сфарміраваўся на глебе дыялогу хрысціянства, іншых вераванняў са старажытным паганствам і адзінствам з навакольным светам, толькі з розным нацыянальным адценнем.

Але якім жа чынам сфарміравалася тая «беларускасць»? Шматлікія беларускія гісторыкі пішуць пра важную ролю станаўлення дзяржаўнасці як вынік камунікацыйнага працэсу паміж людзьмі з пэўнага кавалачка зямлі, які вызначаецца, у сваю чаргу, сваім характэрным рэльефам, што яскрава адбіваецца на складе мыслення жыхара пэўнага месца. Не забудзем і пра культурны дэтэрмінізм. Кожны этнас выпрацоўвае часова-прасторавы хранатып, што дазваляе адрозніваціца ад іншых. «У той меры, у якой хранатып існуе як пэўны тып нормы эмацыйнай рэакцыі, ён з’яўляецца базіснай ці падставовай семантычнай структурай этнасу. На гэтай структуры пазней узнікае Нацыянальны Тэкст» [1, с. 409].

Тэкст, у першую чаргу, звычайна літаратурны, таму бацькамі нацыі з’яўляюцца паэты, якія вельмі добра адчуваюць навакольны свет,

прастору і рытмізаваным словам вызначаюць, дакладна фармулююць змест і сутнасць унікальнага хранатыпу, можна сказаць дэкларатуюць свету аб існаванні сваёй нацыі. Перыяд Беларускага Нацыянальнага Адраджэння з’яўляецца яскравым канцэнтраваным прыкладам.

Набыццё Нацыянальнага Тэксту – момант нараджэння нацыі. Таму ў шырокім сэнсе Нацыянальны Тэкст – «любая семантычная структура, у якой адбіваецца светапогляд, менталітэт і характар дадзенага народа (нацыі)» (гл. [1, с. 410]). Такім чынам, любое мастацтва, у тым ліку і нацыянальная музыка, жывапіс, архітэктура, змяшчае ў сабе свой народны хранатып, які закадзіраваны ў адпаведнасці з відам мастацкай сістэмы і можа быць прачытаным у любы гістарычны час існавання нацыі.

Калі разглядаць месца музычнага мастацтва ў беларускай культуры, яе камунікатыўную функцыю і яе генератыўную моц у сэнсе выхавання і абуджэня нацыянальнай самасвядомасці, то дастаткова прывесці адзін факт, каб падцвердзіць высокае значэнне найбольш эмацыйнага мастацтва: музычны элемент вельмі багата ўплецены ў агульны літаратурны пояс, пачынаючы з «Песні пра зубра» М. Гусоўскага і заканчваючы творамі Ф. Багушэвіча, Цёткі, Я. Купалы, Я. Коласа – гэты спіс бясконцы. Увогуле беларуская паэзія, асабліва перыяду Беларускага Нацыянальнаг Адраджэння ў пачатку XX ст., вылучаецца выразнай музыкальнасцю. Гэта тычыцца і мовы і рытму. Напрыклад, кажучы пра вершы Я. Купалы, мы можам адчуць рытмы жніўеньскіх песень.

Адзначым і менавіта тое, што аналіз музычнага матэрыяла праз семантычны падыход можа на першых кроках здавацца павярхоўным з-за адвечных спрэчак аб прыналежнасці музыкі да агульнай моўнай сям’і. Так, музыказнаўца Банін А.А. прапаноўвае нам пачаць у гэтым выпадку з аналізу народнай музычнай культуры [2], бо менавіта яна непасрэдна развівалася разам з мовай у «адной хатцы, за адным сталом». Можна доўга разважаць наконт музычнай спадчыны праз прызму семантычнага падыходу і казаць, што выраз «музыка – гэта мова» толькі метафара. Але ж успомнім разважанні, напрыклад, Р. Якабсона аб мове і несвядомасці. Сучасная нейрафізіялогія паказвае, што нават мова славесная нараджаецца спачатку ў падсвядомасці, у залежнасці ад розных дэтэрмінантаў, – гэта аб’ядноўвае славесную мову і музычную, тым больш: шматлікія этнамузычныя даследванні даказваюць нам, што фанетычна славесная мова, яе «мелодыя» і музычныя інтанацыі (у дадзеным разважанни гэта будзе як семантычная адзінка) у адным этнічным арэале падобныя.

У беларускім музычным мастацтве прынята вылучаць прафесійнае і народнае мастацтва. Аналізуючы гісторыю менавіта прафесійнага мастацтва, пачынаючы з часоў першых беларускіх княстваў, мы бачым наступнае: фундаментам і цэментаючым матэрыялам з'яўлялася мясцовая народная мелодыка, хай і кажуць пра шматлікія запазычанні. Гэты факт зноў жа накіроўвае нас у бок больш дасканалага вывучэння фальклорнай спадчыны.

Пачнем з выразнай песеннай культуры. У айчыннай фалькларыстыцы і этнамузыкалогіі прынятая наступная перыядызацыя песеннага пласта культуры: раннетрадыцыйны перыяд, што адлічваецца ад фарміравання плямён дрыгавічэй, крывічэй, радзімічэй, а потым паяўленне першых княстваў і да XIV ст.; другі – познетрадыцыйны – XIV-XVII стст. – фарміраванне беларускай народнасці; трэці – XIX-XX стст. – этап ўсвядамлення нацыянальнага багацця, яго пераасэнсавання. У выніку атрымліваецца тысячагадовая гісторыя песеннай традыцыі на Беларусі.

Гістарычна так склалася, што паганства пасля прыходу хрысціянства не сыйшло зусім, а гарманічна ўплялося ў агульную канву беларускага мыслення. Пры гэтым нехрысціянскі элемент на працягу тысячагоддзя захаваўся ў добрым стане, у адрозненні ад іншых культур.

Яшчэ адна асаблівасць традыцыйнай музычнай культуры - добрая захаванасць раннетрадыцыйнага пласта песеннага фальклору, што ў сваю чаргу тлумачыцца некалькімі пунктамі. Па-першае, вялікая роля належыць інстытуту пераемнасці. Купалаўскія радкі «Ад прадзядаў спакон вякоў / Мне засталася спадчына» вельмі дакладна перадаюць сутнасць беларускай традыцыі пераемнасці. Па-другое: некаторая неўсвядомленая прага да самаізаляцыі – як прэзэнтуючая характэрная рыса «зямельнай нацыі». Э.С. Дубянецкі піша: «Беларусам найчасцей была неспрыяльная думка хаця б часова развітацца з роднымі мясцінамі. Спецыфіка беларускай прыроды, рассялення жыхароў нашай Бацькаўшчыны прымацоўвала беларусаў да свайго кавалачка зямлі, што ў выніку прыводзіла да іх своеасаблівага ізаляцыянізму. У беларускім светаўспрыманні няма схільнасці да бязмежжа, як, скажам, у расіянаў, а зусім наадварот» [3, с. 415-416].

Іншым разам, празмерная самаізаляванасць дазваляла прымацаваць ярлык «адсталасці», але, як піша этнамузыколаг З.Я. Мажэйка, менавіта гэтыя «адсталы» земляны народ захаваў «генетычнае ядро самабытнай народнай культуры. Беларусы захавалі ***яго*** ў жыццяздольным стане дзякуючы "выключнасці" вясковага народа з сістэмы пануючых іншанацыянальных (польскай і расійскай) культур» [4, с. 233].

Каляндрна-абрадавыя і сямейна-абрадавыя сістэмы, бытавыя жанры песеннага фальклору складаюць той самы старажытны пласт беларускай культуры, што прадстаўляецца для XXI ст. сапраўдным скарбам. Асабліва ўважліва навукоўцы ставяцца да каляндарна-абрадавага цыклу. Безумоўна, музыка выступае ў кантэксце ўсёй абраднасці фактарам аб’ядноўвання дзеяння і магічнасці словаў. Але даследчык В.В. Калацей настойліва прапаноўваю звярнуць нашу ўвагу ў першую чаргу на эмацыйны аспект музыкі, і ў кантэксце ўзмацнення міжчалавечых адносін і працэса фарміравання самасвядомасці. В.В. Калацей ўзгадвае здабыткі псіханеўралагічнай навукі, у якіх ідзе гаворка аб чацвёртым тыпу актыўнасці мозгу, так званага «малітоўнага стану», пры якім кара галаўнога мозгу адключана, а інфармацыя прымаецца мінуючы працэсы мыслення. «Эмацыяльная еднасць выканаўцаў рытуалу пашырае іх свядомасць, мацнее адчуванне псіхафізічнага задавальнення і абароненасці асобы, здзяйсняецца энергетычны абмен з супольнасцю і прыродай; і тады мы разуеем тое, што не здольныя запісаць, бо не маем словаў для абазначэння гэтага» [5, с. 102-103]. І тут музыка выступае лепшым сябрам, асабліва яе інтанацыйная прырода, якая дапамагае выказаць ***як раз*** тое, што словамі немагчыма, або пакуль што немагчыма. І вось, па меркаванні З.Я. Мажэйкі, аналіз інтанацыйнага складу можа найбольш падрабязней раскрыць сутнасць беларускага мыслення.

У беларускай этнамузыкалогіі даследванні В.І. Елатава ў дадзеным кантэксце з’яўялюцца як раз першай сур’ёзнай спробай семіятычнага аналізу меладычнага, ладавага, рытмычнага матэрыяла народнай творчасці. Адзначым, што ў самога даследчыка адносіны да музычнай семіётыкі парадаксальным вобразам было неадназначным. Але ж вынікі яго працы ўсё адно выкарыстоўваюць паслядоўнікі сцвярджэння, што музыка – гэта семіятычая структура.

В.І. Елатаў даследваў меладычныя, рытмічныя асновы беларускай народнай музыкі, але найбольш паказальным атрымалася даследванне ладавага строю. Безумоўна, лад з’яўляецца люстэркам мыслення чалавека. І вось аўтар піша: «Ладовая основа белорусской народной музыки является важнейшим признаком её национального стиля» [6, с. 208].

Калі ахарактаразаваць увесь працэс фарміравання ладавага строю-мыслення беларусаў, то ўбачым паслядоўнае расшырэнне ладу, што натуральна ў нашым гістарычным-эвалюцыйным кантэксце. Але адзначаецца захаванасць у трансфарміраванай форме ранняга пласта ў выглядзе розных музычных мелізмаў-упрыгожванняў. Між іншым, калі аналізаваць з боку прыроднага дэтэрмінізму, то наш рэльеф не

адрозніваецца варыяцыйнасцю, таму мы можам казаць у гэтым выпадку толькі пра культурную пераемнасць.

Познетрадыцыйная песня ў першую чаргу характарызуецца шырынёю меладычнага дыхання, ў параўнанні з практычна рэчытатыўным спевам раннетрадыцыйнага перыяду. Як адзначае даследчык… «Эта мелодическая распевность, протяженность интонационного смысла, стихия мелоса – одно из основных завоеваний песенного искусства этого периода» [6, с. 98]. Меладычнае расшырэнне пайшло як у гарызантальным напрамку (больш працяглае интаніраванне), так і ў вертыкаль, што В.І. Еўлатаў звязвае са з’яўленнем новых інтанацыйных формул, інтэрвальных скачкоў, меладычных абаротаў, што былі асаблівасцю толькі беларускай музычнай творчасці. Важна адзначыць: адначасова ідзе працэс развіцця і беларускай мовы, мелодыка якой цалкам магла служыць першавобразам беларускага меласа, а магчыма гэта ***і была ўзаемаўплыўная «камунікацыя» паміж дзвюх сістэм.***

Калі мы прааналізуем інструментальную творчасць як працяг песенных традыцый, то убачым, што нават форма і гук народных інструментаў адлюстроўвае светапогляд тагачаснага беларуса. Дастаткова ўспомніць беларускую дуду, колавую ліру, цымбалы і вялікую колькасць разнастайных духавых інструментаў, што існавалі разам з чалавекам у паўсядзённым жыцці і прасторы народнай і прафесінай торчасці.

Важна адзначыць, што народная творчасць у сваім выкананні вылучаецца калектыўнасцю – гэты аспект адразу растлумачвае традыцыйную пераемнасць у высокай ступені і таксама з культурнага боку раскрывае кансалідуючыя працэсы фарміраваня этнасу, нацыі, нацыянальнай сядомасці.

Падсумоўваючы выказанае вышэй, хочацца прывесці выдатныя словы Альбрэхта Гаштольда – нашага славутага канцлера ВКЛ, аднаго са стваральнікаў Статута 1529 г: «Галоўнае Вера, Дзяржава, Культура». Гэтыя «тры кіты» існавання нацыі і сёння з’яўляюцца актуальнымі, таму далейшае шматбаковае вывучэнне музычнай праблемы беларускай культуры, спадзяемся, пасадзейнічае ўзмацненню беларускасці.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Анціпенка А.І. Этас, нацыя, нацыянальная самасвядомасць. Да вызначэння падставовых паняццяў. Мінск: Навука і тэхніка, 1994.

2. Банин А.А. Музыка устной традиции как лингво-музыкальная система [Электронный ресурс]. URL: https://etnos.ru/etnologiya/1001-muzyka-ustnoj-traditsii-kak-lingvo-muzykalnaya-sistema.html (дата обращения: 05.09.2021).

3. Дубянецкі Э.С. Светапогляд беларусаў. Спроба даследвання. // Нацыянальныя і рэгіянальныя культуры, іх узаемадзеянне: зб. матэрыялаў канферэнцый. Мінск: Навука і тэхніка, 1994. С.123-130.
4. Мажэйка З.Я. Беларускае этнамузыказнаўства ў агульнаславянскім кантэксце // Беларусь паміж Усходам і Захадам: праблемы міжнацыянальнага, міжрэлігійнага і міжкультурнага ўзаемадзеяння, дыялогу і сінтэзу: матэрыялы II Міжнароднага кангрэса беларусістаў. Мінск : ННАЦ, 1997. С. 27-38.
5. Калацей В.В. Акцэнтацыя і ахова этнаэкалогіі і духоўнасці ў каляндарных абрадах і святах // Фалькларыстычныя даследаванні: Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі: зб. артыкулаў. Мінск, 2014. С. 101-105.
6. Елатов В.И. Ладовые основы белорусской народной музыки. Минск: Наука и техника, 1964.

# ЛОШИЦА ГОРНОСТАЕВСКАЯ В СОБЫТИЯХ ПЕРВОЙ ЧЕТВЕРТИ XIX ВЕКА

# LOSICA GORNOSTAEVSKAYA IN THE EVENTS OF THE FIRST QUARTER OF THE XIX CENTURY

***Н.М. Новикова***

***N.M. Novikova***

Минск, Республика Беларусь
Minsk, Republic of Belarus
*e-mail: dedal39@mail.ru*

Польский вопрос играл ощутимую роль в европейской политике начала XIX века. Наполеон стал кумиром поляков, надеявшихся в союзе с французами добиться восстановления независимости. В июне 1812 года на территории Беларуси вновь развернулись военные действия. В судьбе Лошицы Горностаевской и её владельцев видим отражение тех событий.

The Polish question played a significant role in the European politics of the early nineteenth century. Napoleon became the idol of the Poles, who hoped in alliance with the French to achieve the restoration of independence. In June 1812, military operations again unfolded on the territory of Belarus. In the fate of Loshitsa Gornostaevskaya and its owners we see a reflection of those events.

*Ключевые слова:* Лошица Одынцовская; эксдивизорский суд; Неморшанский; мельница; вотчина; Виленский университет; армия Наполеона; Российская империя.

*Keywords:* Loshitsa Odyntsovskaya; Exdizor court; Nemorshansky; mill; fiefdom; University of Vilnius; Napoleon's army; Russian Empire.